Іван ШТЭЙНЕР

"ПАКЛОН ТАБЕ, СЛЫННАЯ КУЗНІЦА КАДРАЎ!"

ІВАН ШАМЯКІН І ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ

Кожнаму вядомае імя Івана Пятровіча Шамякіна. Таму мы не будзем падрабязна ўзнаўляць вехі жыццёвага і творчага шляху народнага пісьменніка, а засяродзім увагу на адным аспекце ягонай біяграфіі – Іван Шамякін і Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны.

Бадай ніводзін з беларускіх пісьменнікаў не зведаў такой вялікай папулярнасці і славы на радзіме, у яе блізкім і далёкім замежжы, як наш зямляк. Нядаўна раманы Івана Пятровіча друкаваліся мільённымі тыражамі (толькі пералічэнню ўсіх твораў пісьменніка, якія выйшлі да пачатку 1990-х гг., адведзена аж 17 старонак біябібліяграфічнага слоўніка), імі зачытваліся жыхары былога Саюза ад Калінінграда да Камчаткі, па іх запісваліся ў чаргу ў бібліятэках. Бестселерамі празаіка захапляліся, іх крытыкавалі, але ніхто не заставаўся абыякавым. Іван Шамякін заўсёды паўставаў майстрам сюжэта, займальнай інтрыгі, што трымае чытача ў палоне да канца, пакуль не завершыцца дзеянне. Ды і далейшае бытаванне герояў дапытлівы чытач часта дадумваў сам або завальваў пісьменніка лістамі з наіўнымі просьбамі сказаць, што будзе далей з улюбёнымі персанажамі. А калі дадаць, што аўтар заўсёды абіраў для даследавання надзвычай актуальныя тэмы, якія хвалявалі ўсё грамадства, то можна зразумець сакрэты ягонай вялікай папулярнасці.

Цяпер вакол імя слыннага празаіка разгортваюцца дыскусіі, многія не падзяляюць яго поглядаў на сацыяльнае развіццё грамадства, тым больш што аўтар заставаўся верным прынцыпам сацыялістычнага рэалізму; лічаць, што ягоная спадчына ўжо не вартая такой пашаны, якую мела ў застойныя часы. Можна па-рознаму адносіцца да светапогляду пісьменніка, бачыць у ім кансерватыўныя праявы, аспрэчваць некаторыя ідэалы, але нельга не паважаць Івана Пятровіча за яго шчырасць, адназначнасць жыццёвай і мастацкай пазіцыі, за глыбокую веру ў чалавека і ягонае прызначэнне на зямлі.

Можа, гэта звязана з тым, што Іван Шамякін нарадзіўся ў вёсцы Карма Добрушскага раёна (ён сам бачыў запіс аб нараджэнні ў метрычнай кнізе мясцовай царквы, славутай тым, што тут знаходзяцца нятленныя мошчы святога Іаана Кармянскага) і ўсё яго дзяцінства і юнацтва прайшлі на ўлонні роднай прыроды. Ці не таму назаўсёды засталіся з ім дарагія сэрцу краявіды – вялікія лугі з густой і высокай травой і дубы на беразе Сожа. Менавіта тут ён успрыняў запавет самых дарагіх людзей – бацькоў, – а гэта значыць, і запавет народа: жыць так, каб не было сорамна перад людзьмі. Ягоная маці, амаль непісьменная жанчына, мела вялікае шчырае сэрца і незвычайную дабрыню, якая ў пэўнай ступені і перадалася сыну. Ці не таму і жыў заўсёды яе Іванька па законах сумлення, спрабуючы зрабіць сусвет крыху дабрэйшым і цяплейшым. Іван Пятровіч заўсёды шчыра выконваў жыццёвы абавязак – быў добрым сынам, адданым і верным мужам, клапатлівым бацькам, адважным салдатам: прайшоў праз усю вайну ад Мурманска да Одэра.

Але заўсёды ў яго душы панавала адна страсць – пісаць. Ён пісаў у маленькіх прамежках паміж налётамі варожых "юнкерсаў", калі ўсе, стомленыя і змучаныя, кідаліся падрамаць; пісаў у цяжкія пасляваенныя гады. Дзень працаваў у школе, вечарамі праводзіў пасяджэнні агітатараў, а ноччу, пры газніцы, пісаў. Жыў у беднасці і нястачы (што за зарплата ў настаўні-



Іван Шамякін і рэктар Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта акадэмік Барыс Бокуць.

ка і яго жонкі медсястры!), праз вокны, шыбы ў якіх замяняла гнілая фанера і кавалачкі шкла, за ноч намятала ў пакой снегу, і больш за ўсё – на стол… Пісаў апавяданні, нарысы, раманы. Ствараў, як дэміург, свой сусвет, дзе ўсё будавалася па законах праўды і справядлівасці, дзе жылі прыгожыя знешне і ўнутрана людзі. Ён быў настаўнікам не толькі па прафесіі, але і па прызванні, тым самым працягваючы нацыянальную традыцыю, пачатую Якубам Коласам. Не змяніўся пісьменнік і пасля таго, як да яго прыйшлі заслужаныя слава і прызнанне. Застаўся нястомным працаўніком, што не ўяўляе жыцця без пісьмовага стала, чорнарабочым яе вялікасці Літаратуры, якой ён працягваў верна служыць да апошняга дня. Праўда, познія творы пісьменніка прасякнуты смуткам, песімізмам (згадаем толькі загалоўкі: "Сатанінскі тур", "Бумеранг", "Падзенне", "Без пакаяння", "Злая зорка"). Нялёгка было Івану Пятровічу: памерла любая жонка, не цешыла сэрца сучасная доля нацыянальнай культуры. Як зазначаў народны пісьменнік, *"нестабільнасць, разлад жыцця ў краіне пазбаўляе людзей стымулаў да працы, нараджае дэпрэсію, абыякавасць – абы пражыць сёння. Гэта цяжкая хвароба, самая цяжкая з усіх"*. І далей: *"Цяпер я разумею старых акцёраў. Самае страшнае – сысці са сцэны і быць забытым пры жыцці"*.

Аднак песімістычныя ноткі гучалі ў Івана Пятровіча часова, бо ён па натуры быў аптымістам, а любоў да жыцця і працы – вызначальныя рысы яго характару. Незадоўга да смерці ён пісаў самому сабе: *"Вяртайся, Іван, да літаратуры! Пачаць бы раман! Пра наш дзень… Я ж светлы пісьменнік"*.

Бадай самая светлая старонка ў жыцці Івана Пятровіча – Гомель і Гомельскі ўніверсітэт імя Ф. Скарыны. Будучы ўжо славутым пісьменнікам, ён пры любой нагодзе прыязджаў сюды. І вяла яго не толькі любоў да маленькай радзімы (*"Што зробіш, дарагі чытач, у кожнага з нас свая слабасць, а гэтая слабасць, відаць, ёсць ва ўсіх – пры выпадку і без выпадку сказаць хоць некалькі слоў аб родных мясцінах, аб тых лясах, дзе прайшло тваё маленства, аб тых лугах, дзе ўпершыню мянташыў касу і адчуў, што пот салёны"*), але і светлае, адзінае, велічнае каханне да сваёй незабыўнай Машы (Марыі Філатаўны): *"У Гомелі я неаднойчы адрываўся ад кампаніі сваіх калег, з якімі прыязджаў у родны горад на выступленні, і ішоў па вуліцы Астроўскага. Хадзіў там з дзіўным душэўным трапятаннем. Гэта была вуліца нашага з Машай кахання, на ёй Маша кватаравала, і я штовечар лётаў туды на спатканне"*.

Адразу пасля школы Іван Шамякін стаў студэнтам тэхнікума будаўнічых матэрыялаў, а не філфака Гомельскага педінстытута толькі таму, што не хапала гадоў. Але ўжо тады ён цесна сябраваў з паэтамі Леанідам Гаўрылавым і Кастусём Кірэенкам, студэнтамі гэтай навучальнай установы, з якімі разам уваходзіў у літаб'яднанне пры газеце "Гомельская праўда". Памылка была выпраўлена пасля вайны, калі малады настаўнік і пісьменнік завочна вучыўся ў Гомельскім педінстытуце. Як успамінаў Іван Пятровіч, *«калі першы год – 1946 – здаваў усе прадметы акуратна, то, зрабіўшыся пісьменнікам, стаў хадзіць з "хвастамі". Здаецца, уводзіны ў мовазнаўства ці штосьці падобнае, але блізкае да літаратуры, мудрагелістае, я пераздаваў разы тры, уедлівы русак-выкладчык саромеў мяне: "Какой же вы писатель!" Увогуле з мовамі ў мяне былі нелады, у тым ліку і з беларускай»*. Але ж паміж нашай alma mater і пісьменнікам засталіся вельмі блізкія і сяброўскія ўзаемаадносіны да канца яго жыцця. У архіве кафедры беларускай літаратуры ёсць шматлікія фотаздымкі літаратурных дэсантаў на чале з І. Шамякіным, што кожны год прыязджалі ў ГДУ. Ганарыўся пісьменнік знаёмствам з першым рэктарам універсітэта вядомым фізікам Б. Бокуцем: *"Прыязджаючы на Гомельшчыну, я ніколі не мінаў універсітэт… Бокуць удзяляў асаблівую ўвагу філалагічнаму факультэту. Як ніхто з іншых рэктараў Ён рабіў Гомельскі ўніверсітэт беларускім"*. Да апошняга дня (памёр пісьменнік 14 кастрычніка 2004 г.) працаваў над успамінамі (у тым ліку і пра Гомельшчыну), збіраў матэрыял для будучага музея нашай ВНУ. Незадоўга да яго смерці дэлегацыя ўніверсітэта наведала славутага земляка на яго лецішчы, пабывала ў рабочым кабінеце на кватэры і ў Ждановічах. Іван Пятровіч быў надзвычай усцешаны візітам, згадваў вучобу, перадаваў прывітанне прафесуры, якую добра ведаў, выкладчыкам філфака, студэнтам і моладзі. Вось як ён пісаў у лісце да загадчыка кафедры беларускай літаратуры Івана Штэйнера (лічыў, што рана яму ставіць помнік на малой радзіме, а лепш увагу і сродкі аддаць на развіццё літаратуры).

Прывітанне Вашым калегам! Кланяюся ўсім прапагандыстам маёй творчасці і ўсёй беларускай літаратуры, даволі багатай. Нам ёсць чым ганарыцца! Спадзяюся, чыноўнікі зразумеюць гэта, хочацца дажыць да гэтага шчаслівага часу.

Яшчэ раз усяго найлепшага

1 мая 2002 г. Іван Шамякін

А вось згадкі пра горад і ўніверсітэт у споведзі "Паклон табе, Гомель!", якую Іван Шамякін прыслаў на кафедру незадоўга да смерці.

У адной з навел аўтабіяграфічнага цыкла "Начныя ўспаміны", над якім зараз працую, я расказаў, як мяне, малога, здаецца, яшчэ дашкольніка, бацька-ляснік павёз у Гомель. Уражанне не забылася і за сем дзесяткаў гадоў. Самае яскравае – наведанне музея "Палац князя Паскевіча". Гэта была галоўная славутасць горада. Думаю, яго наведваў кожны, хто прыязджаў у Гомель, бо добра памятаю размовы каля леснічоўкі: "Быў у Гомелі? Бачыў Пашкевіча? (у народзе так называлі князя) Не бачыў? Эх ты, лапух! Нічога ты не бачыў, калі палаца не пабачыў!"

Думаю, што ў той час у сарака пакоях палаца ўсё захоўвалася, як і пры жыцці славутага генерала. Хіба што самыя каштоўныя карціны, скульптуры – нацыянальны скарб – былі вывезены ў Маскву.

Іншым выглядаў музей праз сем-восем гадоў; калі я наведаў яго, паступаючы ў тэхнікум будаўнічых матэрыялаў. Хацеў у чыгуначны – не дарос. Мусіў вывучаць хімію (іх было некалькі – арганічная, неарганічная…), матэматыку, супраціўленне матэрыялаў, тэхналогію вырабу цэглы, цэменту. Але не хімія вызначыла мой жыццёвы лёс. Вечары выходныя я праседжваў у гарадской бібліятэцы – літаральна глытаў мастацкую літаратуру, дабраўся да кніг пасля голаду па іх у Карме, Краўцоўцы.

Выраслі крылы, калі пачаў наведваць літаратурнае аб'яднанне пры "Гомельскай праўдзе". Арганізатарам яго быў намеснік рэдактара Яўменаў. Але на пасяджэннях вялі рэй студэнты педінстытута, паэты, якія ўжо друкаваліся ў мінскіх выданнях, – Кастусь Кірэенка, Леанід Гаўрылаў; лідэрам рускамоўных творцаў быў Дзмітрый Кавалёў.

Я пісаў вершы, многа вершаў. Як было не пісаць, калі закахаўся ў студэнтку медтэхнікума Машу Кротаву, якую ведаў з пятага класа – па вучобе ў Церусе (леснікоў кідалі з месца на месца, як таго Міхала з "Новай зямлі"). Адважыўся пачытаць вершы на пасяджэнні літаб'яднання. Добры Гаўрылаў крытыкаваў паблажліва, далікатна, але бескампрамісны Кірэенка разнёс іх, вершы мае, як кажуць, "у пух і прах", даказваючы, што ніякі я не паэт.

Але я не мог не пісаць пра сваё каханне! І напісаў апавяданне. І яго пахвалілі. Дык дзе яно, маё прызнанне ў прозе! А мой жыццёвы лёс – у той адзінай выбранніцы; у маі 1940, калі я канчаў тэхнікум, а Маша працавала фельчарам у Рэчыцкім раёне, мы ўзялі шлюб. І амаль не жылі разам, ва ўсялякім разе, мядовага месяца не мелі. Мяне заслалі на працу ў Беласток. А потым прызыў у армію.

Вайна. Пяць гадоў разлукі. З жонкай, з бацькамі, з роднай мовай, літаратурай. Але і там, на вайне, я пісаў. У Кандалакшы – "У снежнай пустыні", пад Берлінам, праўда, пасля Перамогі ўжо, – "Помсту"; называю тое, што надрукавана, што ўключана ў зборы твораў.

У кастрычніку 1945 г. зволіўся як спецыяліст: ідзі, хлопча, рабі цэглу, усё ж разбурана, зруйнавана вайной. Але не пра цэглу я думаў. Найперш – пра вучобу. І вядома ж, пра літаратуру. Разумеў: праца на заводзе не дасць вучыцца, на стацыянар жа не паступіць – жонка, дзіця. Трэба жыць! Школа! Толькі ў школе можна вучыцца завочна!

І я прыехаў у Пракопаўку, дзе мая Марыя Філатаўна рабіла фельчарам і мела пакойчык у дваровым доме былога маёнтка. Нехта (Сталін?) прыдумаў разумнае правіла: франтавікі ў любую пару года, як толькі зволіліся з арміі, маглі працягваць перапыненую вучобу і паступаць на завочнае аддзяленне. І ўжо ў лістападзе ці ў пачатку снежня (помню – зімой, у мароз) я здаваў экзамены ў Гомельскі педагагічны інстытут, на гісторыка-літаратурны факультэт. Якія экзамены! Дыктант па беларускай мове; жаданне пісаць па-беларуску здзівіла экзаменатараў; ці не адзін я быў такі "нацыяналіст"! Памылкі я, безумоўна, зрабіў, ды не яны вырашалі лёс. Тым больш, што па гісторыі я адказваў так, што здзівіў старога прафесара (не помню прозвішча).

Паступіў. А як вучыцца? Жылі галодна, халодна. У школе – гадзін 30 нагрузкі мовы беларускай, нямецкай (паступіў на маскоўскія завочныя курсы), грамадская нагрузка – сакратар аб'яднанай сельсавецкай партарганізацыі – на шэсць ушчэнт разбураных калгасаў, а райком патрабуе: пасей, здай, выканай план лесанарыхтоўкі… Але галоўнае – нястрымна хацелася пісаць. Апынуўся сярод партызан, загарэўся іх тэмай. Адразу замахнуўся на раман. Смеласць!

Сядзеў начамі. А ў адзінае вакно з шыбкамі з асколкаў шкла на рукапіс намятала гурбачкі снегу. Але ж трэба і інстытуцкія прадметы вучыць – набліжалася летняя сесія. А па чым вучыць? Дзе ўзяць падручнікі? Ды быў я не ў горшым стане, чым іншыя тагачасныя завочнікі з сельскіх школ. У мяне некаторыя патрэбныя кнігі меліся. Я іх прывёз з Германіі. Здзівіцца чытач? З'ява рэдкая – рускія кнігі з пераможанай Германіі. Але прыгода была такая. Стаялі ў Ландсбергу на Варце (здаецца, цяпер Гожуў Вялікапольскі). І ў адным багатым доме, яўна былога фашыста, бо жылі толькі дзве старыя,

мы з парторгам выявілі вялікую колькасць рускіх кніг са штампам Смаленскага педінстытута. Я настойваў забраць іх у бібліятэку дывізіёна, але зампаліт адмовіўся, паведаміў каменданту: няхай вярнуць у Смаленск. Але я адабраў рускую класіку і тыя кнігі, якія, разумеў, спатрэбяцца для вучобы. І гэтыя кнігі я цягнуў дадому, калі зволіўся з арміі, – два мяшкі. Хто вёз шмаццё – я кнігі; з мяне смяяліся. Але помню выпадак у Брэсце: дэмабілізаваныя штурмам узялі вагон поезда на Гомель; з'явіўся камендацкі патруль і, баючыся чапаць франтавікоў, пачаў выкідваць праз акно іх скарб – чамаданы, клункі. Паднялі мой мяшок. "Во, гад, нарабаваў. Залатыя злітки ці цэглу?" – "Кнігі, хлопцы! Кнігі вязу" – "Нямецкія?" – "Нашы! Немцы вывезлі. Як не забраць такое дабро!" Вельмі здзівіўся чырвонатвары старшына, памацаў кнігі і не выкінуў мяшок. А з ім і я застаўся ў вагоне. Была яшчэ адна праблема: з Церахоўкі да Пракопаўкі дабрацца з такім грузам. Але і тут пашанцавала.

У такіх умовах жыцця і працы я завочнічаў. Сам здзівіўся, калі ў самы галодны 1946 год вытрымаў экзамены па ўсіх прадметах першага курса. Не скажу, што выдатна, але прыстойна. У наступны год ухвалілі на друку першую частку "Глыбокай плыні", прынялі ў сябры Саюза пісьменнікаў. І я, мабыць, трохі зазнаўся: маўляў, умею пісаць і без тэорыі літаратуры, псіхалогіі. За другі курс засталіся "хвасты".

А яшчэ праз год Пятрусь Броўка парэкамендаваў мяне ў Рэспубліканскую партыйную школу. Хто адмовіўся б? Стыпендыя ў два разы большая, чым настаўніцкая зарплата. Ды і хто з нас, маладых, не імкнуўся ў Мінск, бліжэй да выдавецтва, часопісаў! І скончыў я сваю вучобу ў Гомельскім педінстытуце. Дарэмна. Але сувязі з ім не парываў. Узрадаваўся, калі ў 1969 годзе інстытут ператварылі ва Універсітэт. Ганарыўся. Сам напрасіўся ў міністра Мікалая Машкова паехаць з ім на ўрачыстае адкрыццё другога ў рэспубліцы універсітэта – у родным мне Гомелі, які любіў з маленства, недарэмна і аповед свой пачаў з Палаца. Між іншым, калі музей пазней расчараваў, то парк заўсёды здаваўся унікальным помнікам ландшафтнай архітэктуры: паездзіў па свеце, бачыў многія паркі і пераканаўся, што ў сваёй першароднасці Гомельскі не горшы за многія з іх. Горка толькі, што наш нацыянальны помнік не даглядаецца і не зберагаецца так, як гэта робіцца ў іншых краінах.

...Адкрыццё Універсітэта было ўрачыстае – свята ўсёй інтэлігенцыі, усіх, хто рабіў у педінстытуце і заставаўся ва Універсітэце, хто скончыў педінстытут імя Чкалава і працягваў вучобу на ВНУ вышэйшага рангу.

Там, на свяце, пазнаёміўся з першым рэктарам – Уладзімірам Аляксеевічам Белым, выдатным вучоным, дасціпным чалавекам. Але асабліва я зблізіўся з Барысам Васільевічам Бокуцем, у нас устанавілася добрае чалавечае сяброўства. Шчыры беларус, ён заваражыў мяне веданнем роднай літаратуры. Фізік і Паэт – сказаў бы я пра яго. У кожны прыезд у Гомель я заходзіў да Барыса Васільевіча, і мы гутарылі гадзінамі. А прыязджаў я часта, бо яшчэ ў 1951 годзе з дапамогай бацькі, цесця, швагра збудаваў у Церусе, адкуль мая жонка, хаціну, і ў ёй кожнае лета адпачывала мая сям'я, ды і мне там хораша працавалася, хораша адпачывалася ў акружэнні людзей, якіх я ведаў з маленства – маіх равеснікаў з Церухі, Краўцоўкі, Гуты, Грабаўкі...

Па ініцыятыве Бокуця мы заключылі няпісаную дамову: у пачатку кожнага навучальнага года ва Універсітэце – літаратурны вечар. Сакратар Саюза пісьменнікаў, я падбіраў брыгаду паэтаў, празаікаў, крытыкаў – чалавек 10 – 12. Праводзіўся агульнаўніверсітэцкі вечар, надзвычайны па сваім змесце, форме, цеплыні, з якой сустракалі нас студэнты, выкладчыкі, кіраўніцтва горада. А паколькі зала ўсіх змясціць не магла, на другі дзень, разбіўшыся на групы, выступалі на факультэтах. Калі здарылася аварыя на Чарнобыльскай атамнай станцыі, акадэмік Бокуць быў першым, хто пасвяціў мяне ў наступствы трагедыі, пра што ў той час прачытаць было немагчыма. Барыс Васільевіч па сутнасці мяне кансультаваў, калі я працаваў над раманам "Злая зорка". Па-мойму, яшчэ ў значнай меры не ацэнены ўклад гэтага вучонага-гуманіста ў арганізацыі многіх мерапрыемстваў, устаноў, якія памагалі народу і ўладам зменшыць наступствы вялікай бяды.

Думаю, кніга, якая рыхтуецца да выдання ва Універсітэце, раскажа аб укладзе кожнага вучонага і ў Чарнобыльскую праблему, і ва ўздым эканомікі, культуры. Радуюся, што са сцен універсітэта выйшла нямала вядомых беларускіх пісьменнікаў.

Універсітэт скончылі мой сын і зяць, геолагі; на гора нам сын наш рана пайшоў з жыцця – у 41 год. Добрыя спецыяльнасці даў Універсітэт некалькім маім пляменнікам і пляменніцам. Яны і сёння жывуць у Гомелі, мы часта сустракаемся. Для мяне быў і застаецца гэты горад родны.

Шлю ўсім выкладчыкам, усім, хто вучыўся і вучыцца ў сцянах Гомельскага універсітэта імя Ф. Скарыны, усім гамяльчанам самыя шчырыя пажаданні – шчасця вам усім у XXI стагоддзі! Паклон табе, слынная кузніца кадраў! Паклон табе, родны Гомель!

12.01.2002.

Аўтар ахвяруе ганарар на развіццё часопіса.